# КАПЯЛЮШ З ПЯРОМ

## Касцюм свацці — яе зброя

Тутэйшыя жанчыны кажуць, што ў іх спрадвеку шылі такія касцюмы, і свацця на вяселлі была галоўным персанажам. Маладыя — героі дня, віноўнікі ўрачыстасці, а свацці вялі рэй, прыглядвалі за парадкам, сачылі, каб усё ішло адпаведна з правіламі, традыцыямі, каб усім было весела і цікава. Свацця — не тамада на вяселлі ў сучасным сэнсе слова, а спрадвечны сімвал, які ўсе правільна ўспрымалі, таму з задавальненнем ёй падпарадкоўваліся. Вяселлі некалі рабілі вялікія, і свацця на іх была не адна: чым большае і багацейшае вяселле, тым больш сваццяў клікалі. Іх магло быць да паўтара дзясятка. На гэтую ролю запрашалі ў асноўным жанчын, але не забаранялася браць і дзяўчат, бойкіх, вясёлых, вострых на язычок.

**Кіраўнік школьнага музея Алена ГУСЕВА і старшыня сельскага Савета,** у мінулым дырэктар Дома культуры, **Раіса ДЗЯЦУК** знаўцам народнага касцюма ў адзін голас назвалі **Ганну Самуілаўну ГАМАЛЮК.** Да яе і накіроўваемся ў госці. Дома ў Ганны Самуілаўны захоўваецца рарытэт пад назвай «брыжы», рэч з бабулінага куфра. Брыжы — галаўны ўбор, адзін з галоўных элементаў вясельнага касцюма. Гэта асаблівы плат, падобны на карону, расшыты пацеркамі і стужкамі розных колераў і ўпрыгожаны... пер'ем пярэстага пеўня. Чым ярчэйшыя пярыны, тым лепш. Свацця ў такім галаўным уборы, на першы погляд, крыху падобная на індзейца з ранейшых фільмаў. А калі перанесці на нашы рэаліі, то тут угадваецца элемент маскараду.

— Так і трэба, — гаворыць Ганна Самуілаўна — продкі закладвалі пэўны сэнс у вясельнае ўбранне. Свацця — памочнік і саюзнік жаніха, яе павінна было відаць здалёк, яна ж выступае кіраўніком абрадавай дзеі.

Свацця ведае, што гаварыць, калі якія песні спяваць. Песня была абавязковым, адным з найважнейшых атрыбутаў вяселля. Таму і строі ў свацці павінны быць асаблівыя. Кашуля, фартух, спадніца шыліся па ўсіх канонах. На рукавах і фартухах рабілі асаблівыя круглыя нашыўкі — «вочы». Вачэй было многа, што азначала: свацця бачыць усё. У добрай свацці асабліва не пагарэзіш. Гэта датычылася найперш тых, хто без меры налягаў на гарэлку альбо не супраць быў прыхінуцца да чужой жонкі. Свацця ўсё заўважыць і можа выдаць



«Брыжы» са школьнага музея дэманструе Алена ГУСЕВА.

такую прыпеўку, што потым мянушка да нягеглага госця навек прылепіцца. Так што са сваццяй варта сябе трымаць пільна. Раней жа гулялі вяселле не дзень альбо два, а значна больш, таму свацці працавалі, можна сказаць, па зменах. Вось для чаго іх патрабавалася многа.

— У каго на вяселлі было тры-чатыры свацці, — гаворыць Алена Міхайлаўна, — альбо крый Божа, каптан без «вочак», пра такіх маглі сказаць, што мізэрнаватае вяселле зладзілі.

## З вяселля — у музей

Ганна Гамалюк згадвае, як маленькай дзяўчынкай, дзяўчынай, маладзіцай бывала на вяселлях, дзе сваццямі выступалі жанчыны з пакалення яе бацькоў, а потым і сама прымерала «брыжы». «Яшчэ Саша Лёнікаў жаніўся, Мані Шведавай сын жаніўся, — згадвае яна аднавяскоўцаў, — мы хадзілі ў касцюмах». Аднаго з тых жаніхоў сын цяпер у арміі служыць. Значыць, не так даўно адышлі ў гісторыю вяселлі па народных традыцыях. Нейкія дваццаць-трыццаць гадоў. Цяпер, вядома, сваццяў у касцюмах на вясельныя банкеты не клічуць. Хіба толькі асобныя маладыя, якія хочуць аздобіць урачыстасць элементам экзотыкі, каб зрабіць сэлфі не такое, як ва ўсіх. Ну альбо сапраўдныя знаўцы народнай культуры ў якасці кароткага выступлення на фальклорныя матывы запрашаюць вясковую сваццю. Строі паступова перабіраюцца ў музеі.

У музеі Павіццеўскай школы аўтэнтычных касцюмаў некалькі. Тых самых, натуральных, з бабулінага куфра, якім па сто, а то і больш гадоў. Алена Гусева з гонарам дэманструе цэлы шэраг касцюмаў аднавяскоўак, якія ахвяравалі ўборы мам і бабуль для музея. Іх паказваюць усім наведвальнікам, расказваюць пра гісторыю Павіцця, якому каля 500 гадоў. Дом культуры пашыў для выступленняў некалькі строяў на ўзор даўнейшых, але з новых матэрыялаў. Работнікі культурнай галіны выкарыстоўваюць іх для выступленняў і папулярызацыі сваёй спадчыны. Дарэчы, і ў Ганны Самуілаўны ёсць касцюм, які яна пашыла сама, больш яркі і сучасны. Але бабуліна ўбранне яна беражліва захоўвае як сямейную рэліквію.

## Пакрывала для шлюбнай ночы

Так і ў школьным музеі, пашылі «брыжы» на ўзор, назбіралі самых пярэстых пер'яў — атрымаўся хвацкі «капялюш». У гэтым музеі, дарэчы, шмат розных скарбаў. Адзін з іх таксама звязаны з абрадавай тэмай шлюбу. «Ціха» — адмысловае пакрывала, якім маладыя ўкрываліся ў шлюбную ноч. Льняное палатно, сшытае ўдвая, магло, відаць, служыць чахлом для коўдры ў халодную пару, ну а летам хапіла б і ад яго цяпла. Такое пакрывала рыхтавала кожная дзяўчына да вяселля. Бабуліну «ціху» перадала музею **Настасся Іванаўна ТАРАСЮК,** знакамітая вясковая вышывальшчыца. Некалькі яе работ дэманструецца ў музеі. А яшчэ тут ёсць павіццеўскія лялькі — звітыя з саматканага палатна. Руплівыя экскурсаводы з сёмага класа раскажуць, як спявалі, што насілі, што ў печы гатавалі продкі. Страву пад назвай «бяздушнікі» я, напрыклад, не толькі ніколі не каштавала, але і не чула пра яе ніколі. Аказалася, гэта піражкі з фасоляй у якасці начыння. Раней у вёсцы яе гатавалі ўсе.

Дарэчы, Павіцце — вёска надзвычай цікавая, у многім унікальная. Схавалася яна сярод лясоў і балот на самай мяжы з Украінай. Зараз тут жыве каля 1300 чалавек, а раней было значна больш. Да гэтай пары тут шануюць народныя традыцыі, навучаюць па іх дзяцей.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Кобрынскі раён.*



Строі свацці прымервалі школьніцы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пад кантролем

# Бяспечныя і актыўныя

**Падчас школьных канікул асаблівая ўвага з боку ДАІ і МНС удзяляецца выкананню дзецьмі правілаў бяспекі жыццядзейнасці. Пра гэта расказала начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ганна РЫСЯВЕЦ.**

— Трэба памятаць, што ў гэты перыяд узнікае вялікая імавернасць атрымання траўмаў па-за межамі дому, бо большасць часу дзеці хочуць праводзіць на вуліцы. Нярэдка падлеткі выбягаюць на ажыўленую трасу, не гледзячы па баках, калі кіроўцы ажыццяўляюць розныя манеўры на тэрыторыі двара. Таму і бацькам, і настаўнікам неабходна весці тлумачальныя размовы з непаўналетнімі аб правілах бяспечных паводзін на дарозе. Дарэчы, у кожным раёне сталіцы створаны цэнтры бяспекі дарожнага руху. Для дзяцей у перыяд школьных зімовых канікул там пройдуць прафілактычныя акцыі, — паведаміла яна.

Намеснік начальніка аддзела прафілактыкі ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Яўген АБРАМОВІЧ расказаў, што ў кожным раёне ў канікулярны час для школьнікаў запланаваны розныя культурна-забаўляльныя, асветніцкія, спартыўныя мерапрыемствы: спаборніцтвы па кіберспорце, валейбольныя і футбольныя турніры з удзелам непаўналетніх і прадстаўнікоў аховы правапарадку, інспектараў па справах непаўналетніх. Ва ўсіх раёнах сталіцы 30 снежня пройдуць тэматычныя сустрэчы па бяспецы ў побыце, выкарыстанні піратэхнічных сродкаў, правілах паводзін на лёдзе. Таксама ў гэты дзень будуць падведзены вынікі конкурсу «Бяспечны інтэрнэт».

Удзельнікі маладзёжных атрадаў аховы правапарадку Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і супрацоўнікі Беларускага рэспубліканскага таварыства ратавання на водах да 5 студзеня праводзяць акцыю «Зімовы патруль» з мэтай прафілактыкі надзвычайных сітуацый на вадаёмах і прадухілення выхаду людзей на тонкі лёд. Пра гэта расказаў галоўны спецыяліст аддзела праектнай дзейнасці Цэнтральнага камітэта БРСМ Арцём СТРОГАНАЎ: «Падчас школьных зімовых канікул юнакі і дзяўчаты штодня будуць патруляваць берагі рэк і азёр, дзе размешчаны выратавальныя станцыі, а таксама 149 вадаёмаў. Яны нагадаюць насельніцтву пра важнасць выканання правілаў паводзін на лёдзе, меры засцярогі, растлумачаць, што трэба ведаць і рабіць, калі чалавек праваліўся ў ваду».

Адным з кірункаў дзейнасці маладзёжнай арганізацыі з'яўляецца дабрачынны валанцёрскі рух «Добрае сэрца». У яго рамках да 20 студзеня праходзіць дабрачынная акцыя «Цуды на Каляды». Ва ўсіх рэгіёнах краіны валанцёры правядуць конкурсы, святочныя праграмы, адрасныя віншаванні для выхаванцаў дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў, прытулкаў для дзяцей-сірот, дзяцей-інвалідаў, дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, тых, хто знаходзіцца ў рэабілітацыйных цэнтрах, шпіталях і г. д. Таксама моладзь арганізуе збор спартыўнага інвентару, канцылярскіх тавараў, прадметаў для мастацкай творчасці, настольных гульняў, цацак, кніг для дзіцячых сацыяльных устаноў. Па-за ўвагай добраахвотнікаў БРСМ не застануцца і людзі сталага ўзросту.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**


## ОБЪЯВЛЕНИЕ об электронных торгах

Государственное предприятие «БелЮрОбеспечение» объявляет о проведении торгов:

имущество, принадлежащее: **Кныровичу Станиславу Францевичу,** находящееся: г. Столбцы, пер. Товарный, 2А.

Лот № 5.2019.12.00041: здание хранилища, № 622/D-15111, площ. 774,2 кв. м, начальной стоимостью 104000,00 бел. руб.

Ограничения (обременения): ипотека. Арест суда. Запрет судебного исполнителя.

**Торги будут проведены 21.01.2020 (9.00 – 18.00) на сайте e-auction.by.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 16.00 20.01.2020 г. на депозитный счет отдела принудительного исполнения Стлолбцовского района № BY61AKBB36420624014436000000 в ф-ле 624 ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, УНП 600013502.

Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

УНП 192821149



## Результаты рекламной игры «Авто от Мастеркард. Ноябрь»

**Организатор рекламной игры:** ЗАО «Сэлмон-Графикс», юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, комн. 43, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

**Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Ноябрь».**

Срок проведения рекламной игры: в период с 1 ноября 2019 года по 8 января 2020 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3655 от 21.10.2019 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 21 октября 2019 г.

В рекламной игре приняло участие 129 600 физических лиц.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель рекламной игры «Авто от Мастеркард. Ноябрь»

| Главный приз № 1– автомобиль Volkswagen Polo G Trendline FL, № кузова XW8ZZZ61ZLG007299 и денежные средства для уплаты налога в размере 3 701,12 (три тысячи семьсот один) бел. руб. 12 копеек | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № п/п | № Шанса | Номер карты | Ф.И.О. победителя | Населенный пункт |
| 1 | 124 453 | 70833700950011141200010 | Мороз Павел Петрович | Минск |

Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: (МТС – 033, А1 – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно



**ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки бумаги офисной формата А4 № 2019-771668**, размещенной на сайте **http://www.icetrade.by** по «Целлюлозно-бумажное производство > Бумага для офиса».

УНП 100357923